Слова для Жыцця (152)

Аўтар: Рэдакцыя
10.12.2017 00:00



Папа Францішак

Будаванне культуры сустрэчы і супрацоўніцтва патрабуе чагосьці большага, чым толькі талерантнасці. Патрабуе ад нас працягнутай рукі, даверу і зразумення. […] Гэта дазваляе распачаць дыялог жыцця, а не толькі абменьвацца думкамі. Вымагае добрай волі і прыняцця. Але не належыць блытаць таго з абыякавасцю ці стрыманасцю ў выражэнні сваіх глыбокіх перакананняў. Плённа ўзаемадзейнічаць з іншымі – значыць дзяліцца рознымі рэлігійнымі і культурнымі ідэнтычнасцямі заўсёды пакорна, сумленна і з павагай.

Адкрытасць сэрца з’яўляецца той пілігрымкай, якая вядзе да пошуку дабра, справядлівасці і салідарнасці. Падштурхоўвае клапаціцца аб карысці для нашых бліжніх. У Пасланні да Рымлянаў св. Павел нагадваў: “Не дай злу сябе перамагчы, але перамагай зло дабром” (Рым 12, 21). Гэта пастава, якую мы ўсе можам пераймаць. Рэлігійны клопат пра дабро нашых бліжніх, што выплывае з адкрытага сэрца, цячэ, як вялікая рака, заліваючы бясплодныя, пустынныя землі нянавісці, карупцыі, убоства і насілля, якія так моцна знішчаюць людское жыццё, раздзяляюць сем’і і нявечаць дар стварэння.

Фрагмент прамовы падчас Міжрэлігійнай экуменічнай сустрэчы ў Бангладэш, 01.12.2017 †

Слова для Жыцця (152)

Аўтар: Рэдакцыя
10.12.2017 00:00

